4. https://github.com/dmitry-kosachev/NYT_archive_metadata_parsing_on_USSR?tab=readme-ov-file (date of access: 17.03.2025)
5. https://github.com/dmitry-kosachev/NYT_archive_metadata_parsing_on_USSR/blob/main/flattering_the_keywords_column.ipynb (date of access: 17.03.2025)
6. The News and Public Opinion: Media Effects on Civic Life / M. McCombs, R. Lance Holbert, S. Kiousis, W. Wanta. – Cambridge : Polity Press, 2011. – 210 p.
7. Leff, L. Buried by the Times : the Holocaust and America's Most Important Newspaper / L. Leff. – New York : Cambridge University Press, 2005. – 426 p.
8. Puglisi, R. Being The New York Times: the Political Behaviour of a Newspaper / R. Puglisi // The B.E. Journal of Economic Analysis & Policy – Vol. 11 – 2011. Iss. 1 (Contributions), Art. 20.
9. Salisbury, H. E. Without Fear or Favor: the New York Times and its Times / H. E. Salisbury. – NY Times Books, 1980. – 648 p.
10. Talese, G. The Kingdom and the Power: Behind the Scenes at The New York Times / G. Talese. – NY, Random House Trade Paperback, 2007. – 596 p.
11. Times Index Names Editor; Gephart to Be Consultant – 28.09.1960. – URL: https://timesmachine.nytimes.com/timesmachine/1964/09/28/118537970.html?pageNumber=30&login=smartlock&auth=login-smartlock (date of access: 17.03.2025).

**Чэчулін З.В.**

## “ТЭКІ НАРУШЭВІЧА” ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ І РЭКАНСТРУКЦЫІ АРХІВА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIV – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XV СТ.)

*Ключавыя словы: Адам Нарушэвіч, “Тэкі Нарушэвіча”, Мацей Догель, архіў вялікіх князёў літоўскіх, архіў Каралеўства Польскага, акт, дакумент.*

“Тэкі (папкі) Нарушэвіча” былі створаныя ў перыяд з 1781 па 1785 гг. [14, s. 19] і складаюцца з 231 рукапіснага тома, якія ўтрымліваюць спісы (копіі) 38270 гістарычных крыніц. Каардынатарам праекта быў вядомы дзеяч навукі, вялікі пісар ВКЛ (з 1781 г.) Адам Нарушэвіч (1733–1796) [1, с. 348]. Падставай для стварэння “тэк” была праца А. Нарушэвіча над “Гісторыяй польскага народа”, для напісання якой патрабавалася выявіць і скапіяваць крыніцы. Храналагічна “тэкі” ахопліваюць перыяд з 1227 па 1729 г. [27] і сістэматызаваныя па храналагічнаму прынцыпу. Аднак з улікам таго, што перапісчыкі ў некаторых выпадках памыляліся з устанаўленнем правільнай даты дакумента, гэта часткова вяло да парушэння гэтага прынцыпу.

На дадзены момант з 231 тома “тэк Нарушэвіча” 217 тамоў знаходзяцца на захоўванні ў Бібліятэцы князёў Чартарыйскіх у Кракаве [14, s. 22]. Цікавячы нас перыяд прадстаўлены тамамі № 7–17. Капіісты de visu працавалі з арыгіналамі дакументаў з аддзела “Lithuania” архіва Каралеўства Польскага, якія былі перавезены ў 1765 г. з Кракаўскага замка ў Варшаўскі каралеўскі замак [24, s. 125]. На гэта указваюць адпаведныя запісы, змешчаныя ў правых верхніх кутах аркушаў: “Ex Originali in archivo Regnis”, або “Ex ms arch. Stan. Aug. Regni”. Храналагічна першы дакумент, скапіяваны з арыгінала, датуецца 7 лістапада 1367 г. [13, № 65, k. 261–262], апошні – 6 чэрвеня 1393 г. [14, № 142, k. 565–566]. Гэтая частка дакументаў архіва вялікіх князёў літоўскіх трапіла ў архіў Каралеўства Польскага яшчэ ў 1386 г. пры ажыцяўленні каранацыйных мерапрыемстваў Ягайлам, а архіў князя Скіргайлы трапіў у склад архіва Каралеўства Польскага або ўвосень 1393 г., калі Скіргайла пачаў знаходзіцца пры каралеўскім двары Уладзіслава II Ягайлы [5, с. 32], або пасля смерці Скіргайлы 10 студзеня 1395 г. у Кіеве [4, с. 23].

Што датычна храналагічна пазнейшых дакументаў, то Нарушэвіч і яго група капііставў не працавалі з іх арыгіналамі de visu. Адносна гэтага ў правых верхніх кутах аркушаў маюцца адпаведныя запісы: “Ex archivo Regnis Collect. Dogieli”. У некаторых выпадках да апошніх запісаў дадавалася: “Ex originali Niesvisciense”, што ўказвае на

захоўванні ў тыя часы таго ці іншага арыгінала дакумента ў Нясвіжскім архіве Радзівілаў. Вядома, што А. Нарушэвіч не адзін выконваў працу па капіяванню дакументаў – на яго працавала шмат тэхнічных выканаўцаў (перапісчыкаў), якія ў залежнасці ад свайго бачання неабходнасці ўказання правеніенцыйных запісаў да дакумента рабілі гэта па-рознаму – або перад тэкстам дакумента, або пасля яго.

Такім чынам, яшчэ адной крыніцай стварэння "тэк" стала неапублікаваная і на дадзены момант страчаная рукапісная спадчына Мацея Догеля (1715–1760), якая тады знаходзілася на захоўванні ў Варшаўскім каралеўскім архіве. У часы буйной палявой археаграфічнай працы, звязанай з падрыхтоўкай "Дыпламатычнага кодэксу", М. Догель працаваў з арыгіналамі дакументаў, паходзячых з архіва вялікіх князёў літоўскіх, якія ў той час знаходзіліся на захоўванні ў Нясвіжскім архіве Радзівілаў. Асабліва яскрава пра гэта сведчаць лісты М. Догеля да службовых асоб гэтага архіва [25, s. 106–107].

Засяродзім сваю ўвагу на арыгіналах дакументаў, якія не дайшлі да нашага часу. Да гэтых дакументаў адносяцца: ліст папы рымскага Клімента VI да князя Кейстута ад 18 кастрычніка 1349 г., які быў скапіяваны двойчы [12, № 80, k. 393–394; № 81, k. 395–396], ліст папы рымскага Грыгорыя XI да вялікага князя Альгерда і князя Кейстута ад 25 кастрычніка 1373 г. [13, №. 108, k. 391–392], арыгінал агульназемскага прывілея ад 20 лютага 1387 г. [14, № 33, k. 107–109], прывілей Уладзіслава II Ягайлы князю Скіргайле ад 22 ліпеня 1391 г. [14, № 108, k. 427–428], пацвярджальны акт польскага караля Уладзіслава II Ягайлы аб урэгуляванні адносін паміж князямі Скіргайлам і Вітаўтам ад 6 снежня 1392 г. [14, № 133, k. 545], акт гербавай адопцыі польскай кароннай шляхты ад 2 кастрычніка 1413 г. [16, № 67, k. 325–328].

Вышэйназваныя дакументы былі страчаныя ў розныя часы – папскія лісты 1349 і 1373 г., а таксама ўсе лісты Марціна V да Вітаўта былі страчаныя ўжо падчас складання з іх спісаў (копій). Арыгінал агульназемскага прывілея ад 20 лютага 1387 г. апошні раз фіксуецца ў архіўнай уліковай дакументацыі ў 1755 г. [26, p. 287], але згадваецца ў лісце М. Догеля ад 20 лютага 1757 г. [25, s. 106]. Магчыма, ён быў страчаны пасля 1757 г. Прывілей Уладзіслава II Ягайлы князю Скіргайле ад 22 ліпеня 1391 г. і пацвярджальны акт Уладзіслава II Ягайлы аб урэгуляванні адносін паміж князямі Скіргайлам і Вітаўтам ад 6 снежня 1392 г. былі страчаныя ў перыяд паміж 1782 і 1808 гг. Гэта пацвярджае вопіс, складзены ў 1808 г. ў Пецярбурзе пры перадачы дакументаў, вывезеных расійскімі ўладамі з архіва Каралеўства Польскага ў Дэпо Манускрыптаў пры Імператарскай Публічнай Бібліятэцы, у якім гэтыя дакументы адзначаны як страчаныя; у пазнейшых крыніцах яны не згадваюцца [2, с. 463]. Да пазнейшых дакументальных страт адносіцца арыгінал акта гербавай адопцыі польскай кароннай шляхты ад 2 кастрычніка 1413 г., які загінуў у Варшаве падчас антыфашысцкага паўстання ў 1944 г. [3, с. 105].

Адзначым і дрэнна захаваныя арыгіналы дакументаў – лісты пап рымскіх Марціна V ад 28 кастрычніка 1428 г. [9] і Яўгенія IV ад 1431 г. [8] да князя Жыгімонта Кейстутавіча, якія па стану на 2025 г. амаль не чытальныя. У кепскім стане знаходзіцца арыгінал акта дагавора малдаўскага ваяводы Іллі з вялікім князем літоўскім Жыгімонтам Кейстутавічам, памылкова датаванага 1437 г. (насамрэч 1435 г.) [10]. Ад арыгінала прывілея польскага караля Уладзіслава II Ягайлы аб ўраўненні ў правах рускіх і літоўскіх нобіляў і баяр ад 15 кастрычніка 1432 г. адарваная прыблізна 1/5 частка дакумента наўскос злева [11], таму яго спіс [19, № 62, k. 193–197] з'яўляецца крыніцай, што адлюстроўвае ўвесь тэкст дакумента.

Шэраг скапіяваных дакументаў падчас складання "тэк" былі некарэктна датаваныя перапісчыкамі, таму ў табліцы прыводзяцца правільныя даты, устаноўленыя паводле тэкстаў арыгіналаў дакументаў. Архіўныя шыфры пададзеныя ў адпаведнасці з электронным каталогам калекцыі пергамінавых дакументаў (польск. Zbiór dokumentów

pergaminowych, далей – ZDP) Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве (польск. Archiwum Główne Akt Dawnych, далей – AGAD) [28], папяровым каталогам пергамінавых дакументаў Бібліятэкі князёў Чартарыйскіх у Кракаве (польск. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie, далей – BCz) [23], і апошнім выданнем "Полацкіх грамат" [6].

## СПІС ДАКУМЕНТАЎ З "ТЭК НАРУШЭВІЧА", ЯКІЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АРЫГІНАЛАЎ УВАХОДЗІЛІ Ў СКЛАД АРХІВА ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ (1349–1440 ГГ.)

| Від дакумента (найменні) | Дата | № «тэкі» і аркушаў | Месцазнаходжанне арыгінала |
|---|---|---|---|
| 1. Ліст папы рымскага Клемента VI да князя Кейстута | 18 кастрычніка 1349 г. | Т. 7. № 80, k. 393–394; ён жа: № 81. k. 395–396. | Арыгінал страчаны. |
| 2. Акт дагавора аб міры паміж магістрам Тэўтонскага ордэна ў Лівоніі Вільгельмам фон Фрымерсхаймам і вялікім князем літоўскім Альгердам | 7 лістапада 1367 г. | Т. 8. № 65. k. 261–262. | AGAD. ZDP. № 4526. |
| 3. Ліст папы рымскага Грыгорыя XI да вялікага князя літоўскага Альгерда | 23 кастрычніка 1373 г. | Т. 8. №. 108. k. 391–392. | Арыгінал страчаны. |
| 4. Акт перамір'я паміж магістрам Тэўтонскага ордэна ў Лівоніі Вільгельмам фон Фрымер-схаймам і вялікім князем літоўскім Ягайлам | 27 лютага 1380 г. | Т. 8. №. 163. k. 589–590. | AGAD. ZDP. № 4529. |
| 5. Акт перамір'я паміж вялікім магістрам Тэўтонскага ордэна Конрадам Цольнерам фон Ротэнштайнам і вялікім князем літоўскім Ягайлам | 21 красавіка 1385 г. | Т. 8. № 203. k. 737–738. | AGAD. ZDP. № 4434. |
| 6. Акт перамір'я паміж вялікім маршалам Тэўтонскага ордэна Конрадам фон Валенро-дам і вялікім князем літоўскім Ягайлам | 24 красавіка 1385 г. | Т. 8. № 204. k. 739–740. | AGAD. ZDP. № 4484. |
| 7. Акт перамір'я паміж вялікім магістрам Тэўтонскага ордэна Конрадам Цольнерам фон Ротэнштайнам і вялікім князем літоўскім Ягайлам | 30 мая 1385 г. | Т. 8. №. 205. k. 741–742. | AGAD. ZDP. № 4433. |
| 8. Гарантыйны акт комтура Мітавы Дзітрыха фон Вайлбурга купцам ВКЛ | 17 снежня 1385 г. | Т. 8. № 212. k. 763–764. | AGAD. ZDP. № 4531. |
| 9. Акт польскага караля Уладзіслава II Ягайлы аб высылцы князя Скіргайлы на тэрыторыю Літвы | 13 сакавіка 1386 г. | Т. 9. № 6. k. 25–26. | BCz. Perg. 196. |
| 10. Агульназемскі прывілей польскага караля Уладзіслава II Ягайлы | 20 лютага 1387 г. | Т. 9. № 33. k. 107–109. | Арыгінал страчаны. |
| 11. Прывілей польскага караля Уладзіслава II Ягайлы вялікаму князю літоўскаму Скіргайле | 28 красавіка 1387 г. | Т. 9. № 37. k. 133–136 (пераклад рутэнскага тэксту на лацінскую мову); Т. 9. № 38. k. 137–139 (лацінскай трансліт. з арыгінала) | ОР БАН. 4.6.44. |
| 12. Акт перамір'я паміж магістрам Тэўтонскага ордэна ў Лівоніі Робінам фон Эльцам і вялікім князем літоўскім Скіргайлам | 9 ліпеня 1387 г. | Т. 9. № 42. k. 151–152. | AGAD. ZDP. № 4485. |
| 13. Грашовае абавязальніцтва каралеўскага слугі (Уладзіслава II Ягайла) Іванкі перад вялікім князем літоўскім Скіргайлам | 9 лістапада 1387 г. | Т. 11. № 39. k. 167–168. | BCzart. Perg. 292. Vol. VII/5 |
| 14. Акт перамір'я паміж вялікім магістрам Тэўтонскага ордэна Конрадам Цольнерам фон Ротэнштайнам і вялікім князем літоўскім Скіргайлам | 4 лістапада 1388 г. | Т. 9. № 57. k. 195–196. | AGAD. ZDP. № 4441. |
| 15. Акт перамір'я паміж князем Вітаўтам і князем Скіргайлам | 29 мая 1389 г. | Т. 9. № 75. k. 253 | AGAD. ZDP. № 4443. |
| 16. Прывілей Уладзіслава II Ягайлы князю Скіргайле на Вільню, Мерач, Віцебск | 22 ліпеня 1391 г. | Т. 9. № 108. k. 427–428. | Арыгінал страчаны. |
| 17. Пацвярджальны акт польскага караля | 6 снежня 1392 г. | Т. 9. № 133. k. 545. | Арыгінал страчаны. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Уладзіслава II Ягайлы аб урэгуляванні адносін паміж князямі Скіргайлам і Вітаўтам | | | |
| 18. Акт прымірэння паміж князямі Вітаўтам і Скіргайлам | 6 снежня 1392 г. | Т. 9. № 148. k. 583–585. | BCzart. Perg. 236 |
| 19. Паручальніцтва рыжскага бюргера Германа Дасберга за жыхароў Мінскай зямлі перад князем Скіргайлам | 30 мая 1393 г. | Т. 9. № 149. k. 587. | AGAD. ZDP. № 4445. |
| 20. Паручальніцтва рыжскага бюргера Германа Дасберга за 9 лівонскіх рыцараў перад князем Скіргайлам | 6 чэрвеня 1393 г. | Т. 9. № 142. k. 565–566. | BCzart. Perg. 239. Vol. I/45 |
| 21. Акт Віленска-Радамскай уніі | 11 сакавіка 1401 г. | Т. 10. № 21. k. 87–91. | AGAD. ZDP. № 8418. |
| 22. Акт гербавай адопцыі польскай кароннай шляхты, выдадзены нобілям і баярам вялікага князя літоўскага Вітаўта | 2 кастрычніка 1413 г. | Т. 11. № 67. k. 325–328. | Арыгінал страчаны. |
| 23. Грашовае абавязальніцтва польскага караля Уладзіслава II Ягайлы перад вялікім князем літоўскім Вітаўтам | 25 кастрычніка 1417 г. | Т. 11. № 120. k. 545. | BCz. Perg. 322.Vol. I/52. |
| 24. Ліст папы рымскага Марціна V да вялікага князя літоўскага Вітаўта | 1425 г. | Т. 14. № 68. k. 309–310. | Арыгінал страчаны. |
| 25. Ліст папы рымскага Марціна V да вялікага князя літоўскага Вітаўта | 5 лютага 1426 г. | Т. 14. № 100. k. 451–452. | Арыгінал страчаны. |
| 26. Ліст папы рымскага Марціна V да вялікага князя літоўскага Вітаўта | 14 сакавіка 1427 г. | Т. 14. № 110. k. 507–508. | Арыгінал страчаны. |
| 27. Ліст папы рымскага Марціна V да князя Жыгімонта Кейстутавіча | 23 снежня 1428 г. | Т. 14. № 122. k. 549–550. | AGAD. ZDP. № 7280. |
| 28. Ліст папы рымскага Яўгенія IV да князя Жыгімонта Кейстутавіча | 1431 г.? | Т. 15. № 23. k. 87–88. | AGAD. ZDP. № 7278. |
| 29. Прывілей польскага караля Уладзіслава II Ягайлы аб ураўненні ў правах рускіх і літоўскіх нобіляў і баяр | 15 кастрычніка 1432 г. | Т. 15. № 62. k. 193–197. | AGAD. ZDP. № 8420. |
| 30. Прывілей караля польскага Уладзіслава II Жыгімонту Кейстутавічу аб зацвярджэнні яго ў вялікакняскай годнасці | 3 кастрычніка 1433 г. | Т. 15. № 68. k. 221–224. | AGAD. ZDP. № 8421. |
| 31. Агульназемскі прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча | 6 мая 1434 г. | Т. 15. № 128. k. 435–436. | AGAD. ZDP. № 7267. |
| 32. Акт дагавора паміж малдаўскім ваяводам Іллёй і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам Кейстутавічам | 1435 г. | Т. 16. № 64. k. 339 (пераклад на лацінскую мову); Т. 16. № 66. k. 343 (трансліт. рутэнскага тэксту лацінскімі літарамі) | AGAD. ZDP. № 7285. |
| 33. Ліст шляхты Польскага Каралеўства да вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча | 6 снежня 1437 г. | Т. 16. № 60. k. 321–322. | AGAD. ZDP. № 7276. |
| 34. Ліст Базэльскага сабора да вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча | 26 жніўня 1439 г. | Т. 16. № 116. k. 543. | AGAD. ZDP. № 7279. |
| 35. Канфірмацыйны прывілей польскага караля Уладзіслава III для вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча | 7 студзеня 1440 г. | Т. 17. № 2. k. 15–16. | AGAD. ZDP. № 7284. |

Такім чынам, тэксты дакументаў, паходзячых з архіва вялікіх князёў літоўскіх за вывучаемы намі перыяд, змешчаныя ў “тэках” па храналагічнай прыкмеце, былі скапіяваныя з розных крыніц – у першую чаргу гэта арыгіналы, што знаходзіліся ў архіве Каралеўства Польскага, які ў 1765 г. быў перавезены з Кракава ў Варшаву, а таксама неапублікаваныя і на дадзены момант страчаныя тамы “Дыпламатычнага кодэксу” М. Догеля. Адзначым, што тэксты рукапісаў М. Догеля, а таксама некаторыя апублікаваныя ім дакументы, якімі кіраваліся капіісты, ўтрымліваюць шмат памылак, скажэнняў, нават пропускаў цэлых радкоў тэксту ў публікацыях дакументаў, што папярэдне намі разглядалася ў адпаведным артыкуле [7, с. 183]. Тое самае датычна і

спісаў дакументаў, прадстаўленых у “тэках Нарушэвіча”. Разам з гэтым, “тэкі Нарушэвіча” з’яўляюцца каштоўнай крыніцай для рэканструкцыі тэкстаў страчаных дакументаў, вывучэння дынамікі дакументальных страт і практык выкарыстання дакументаў, паходзячых з архіва вялікіх князёў літоўскіх.

На дадзены момант 20 арыгіналаў дакументаў з архіва вялікіх князёў літоўскіх знаходзяцца на захоўванні ў ГАСА (AGAD), 5 – у Бібліятэцы князёў Чартарыйскіх у Кракаве (BCzart), 1 – у навукова-даследчым аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Расійскай акадэміі навук (НИОР БАН). Астатнія дакументы ў колькасці 9 адзінак не захаваліся ў якасці арыгіналаў.


1. Пазднякоў, В. Нарушэвіч Адам Тадэвуш Станіслаў / В. Пазднякоў // Вялікае княства літоўскае : энцыклапедыя. Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : БелЭн, 2007. – С. 348–349.
2. Книга посольская Метрики Великого княжества Литовского, содержащая в себе дипломатические сношения Литвы в государствование короля Сигисмунда Августа с 1545 по 1572 год Ч. 1 / изд. М. Оболенский, И. Данилович. – М. : Университетская тип., 1843. – XX, 480 [2] с.
3. Латушкін, А. М. Аднаўленне цэласнасці комплексу арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў канца XIV – пачатку XVII ст. архіва Вялікага Княства Літоўскага: пастаноўка праблемы / А. М. Латушкін // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2017.– № 4. – С. 98–107.
4. Ліцкевіч, А. У. Атручэнне князя Скіргайлы ў Кіеве (1395 год). Гістарычны каментарый і праблема аўтарства другой часткі “Летапісца вялікіх князёў літоўскіх” / А. У. Ліцкевіч // ARCHE–Пачатак. – 2012. – № 3. – С. 8–52.
5. Полехов, С. В. Древнерусские пометки на латинских документах в Великом княжестве Литовском и Польском королевстве второй половины XIV века / С. В. Полехов // Древняя Русь. Вопросы медиевистики. – 2021. – № 2(84). – С. 27–40.
6. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. – Т. 1. – М. : Русский фонд содействия образованию и науке, 2015. – 864 с., XVI с.
7. Чэчулін, З. В. Дакументы архіва вялікіх князёў літоўскіх другой паловы XIV – першай паловы XV ст. у святле археаграфіі / З. В. Чэчулін // Беларускі археаграфічны штогоднік. – 2024. – Вып. 25. – С. 183–190.
8. AGAD. – Zbiór Dokumentów Pergaminowych. – Sygn. 7278.
9. AGAD. – Zbiór Dokumentów Pergaminowych. – Sygn. 7280.
10. AGAD. – Zbiór Dokumentów Pergaminowych. – Sygn. 7285.
11. AGAD. – Zbiór Dokumentów Pergaminowych. – Sygn. 8420.
12. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 7 Odpisy 174 dokumenów z lat 1340–1359.
13. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 8. Odpisy 212 dokumentów z lat 1360–1385.
14. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 9 Odpisy 224 dokumentów z lat 1386–1399.
15. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 10 Odpisy 172 dokumentów z lat 1400–1410.
16. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 11. Odpisy 124 dokumentów z lat 1411–1417.
17. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 12. Odpisy 95 dokumentów z lat 1418–1422.
18. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 14. Odpisy 152 dokumentów z lat 1423–1429.
19. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 15. Odpisy 149 dokumentów z lat 1430–1434.
20. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 16. Odpisy 131 dokumentów z lat 1435–1439.
21. Biblioteka książąt Czartoryskich w Krakowie. – Naruszewicz teka. T. 17. Odpisy 237 dokumentów z lat 1440–1444.
22. Grzybowski, S. Teki Naruszewicza: "Acta Regum et Populi Poloni" / S. Grzybowski. – Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1960. – 69 s.
23. Katalog dokumentów pergaminowych Biblioteki Czartoryskich w Krakowie. Cz. 1. Dokumenty z lat 1148–1506 / oprac. J. Tomaszewicz. – Kraków, 1975. – 434 s.
24. Kłodziński, A. O Archiwum Skarbca Koronnego na Zamku Krakowskim / A. Kłodziński // Archiwum Komisji historycznej. – Kraków, 1923. – Seria 2, t. I. – S. 124–577.
25. Kurkowski, J. Z dziejów polskiego edytorstwa źródeł historycznych. Maciej Dogiel (1715–1760) / J. Kurkowski // Analecta. Studia i Materiały z Dziejów Nauki. – 2006, nr 1/2, – S. 89–157.
26. Latushkin, A. All-terrestrial charters in the archive of the Grand Dukes of Lithuania: composition, signs of provenance and modern places of storage of originals / Andrei Latushkin // Tyragetia, serie nouă: Museul Naţional de Istorie a Moldovei. – Vol. XVII [XXXII]. – Nr. 2: Istorie. Muzeologie. – 2023. – P. 279–292.
27. Teki Naruszewicza : [сайт]. – URL: https://cyfrowe.mnk.pl/dlibra/publication/3930#structure (дата звароту: 02.02.2025).
28. Zbiór Dokumentów Pergaminowych AGAD Wstępna wersja robocza II '23 Inwentarz, układ w kolejności sygnatur : [сайт]. – URL: http://agad.gov.pl/inwentarze/preg_work.xml (дата звароту: 02.02.2025).